ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
20.10.2025 № 447

Праграма ўступных іспытаў
па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства»
для атрымання агульнай вышэйшай
і спецыяльнай вышэйшай адукацыі,
2026 год

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма ўступных іспытаў па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» прызначана для асоб, якія паступаюць ва ўстановы вышэйшай адукацыі для атрымання агульнай вышэйшай і спецыяльнай вышэйшай адукацыі.

Праграма структуравана ў адпаведнасці з асноўнымі змястоўнымі лініямі грамадазнаўчай адукацыі.

Уступныя іспыты па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» праводзяцца з выкарыстаннем тэстаў. Змест тэставых заданняў вызначаецца дадзенай праграмай уступных іспытаў, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ АБІТУРЫЕНТАЎ

Абітурыент павінен ведаць:

– асноўныя з’явы і працэсы, якія характарызуюць сацыяльнае, эканамічнае, палітыка-прававое, духоўнае жыццё сучаснага грамадства, і паняцці, якія адлюстроўваюць сутнасць з’яў і працэсаў;

– прыярытэты палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе;

– асноўныя палажэнні ідэалогіі беларускай дзяржавы;

– змест Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскім рэферэндуме 27 лютага 2022 года).

Абітурыент павінен умець:

– аналізаваць, сістэматызаваць, абагульняць вывучаныя грамадскія з’явы і працэсы;

– параўноўваць вывучаныя грамадскія з’явы і працэсы, выяўляць іх агульныя рысы і адрозненні;

– раскрываць прычынна-выніковыя сувязі паміж грамадскімі з’явамі і працэсамі;

– вызначаць паслядоўнасць грамадскіх з’яў і працэсаў;

– усталёўваць адпаведнасць паміж прапанаванымі мноствамі (грамадскімі з’явамі, працэсамі і паняццямі, якія адлюстроўваюць іх сутнасць);

– аналізаваць нескладаныя статыстычныя даныя, якія адлюстроўваюць сацыяльныя, эканамічныя, палітычныя, духоўныя з’явы і працэсы;

– здабываць з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), неабходную інфармацыю, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### 1. ЧАЛАВЕК. ГРАМАДСТВА. КУЛЬТУРА

Унікальнасць чалавека. Біялагічнае, псіхалагічнае і сацыяльнае ў чалавеку. Індывід. Індывідуальнасць. Асоба. Свядомасць і самасвядомасць.

Тэмперамент, характар, здольнасці. Паняцце тэмпераменту, тыпы тэмпераменту і іх характарыстыка. Паняцце характару, тыпы і рысы характару. Паняцце здольнасцей, віды здольнасцей, узроўні і спосабы іх развіцця.

Эмоцыі, пачуцці, воля. Эмоцыі і эмацыйныя станы. Віды эмоцый і пачуццяў. Спосабы кіравання эмоцыямі і пачуццямі. Паняцце волі, развіццё валявых якасцей асобы.

Накіраванасць асобы. Светапогляд і яго роля ў жыцці чалавека. Духоўны свет асобы. Бездухоўнасць і яе прычыны.

Пазнанне чалавекам самога сябе. Спосабы самапазнання. Я-канцэпцыя (я-вобраз). Паняцце самаацэнкі, узроўні самаацэнкі. Шляхі самаразвіцця асобы.

Дзейнасная сутнасць чалавека. Паняцце дзейнасці. Структура дзейнасці. Паняцце патрэбы, віды патрэб. Матывы дзейнасці. Узаемасувязь патрэб і матываў у дзейнасці чалавека. Віды дзейнасці.

Культура, яе прызначэнне і функцыі. Паняцце культуры, асноўныя падыходы да разумення культуры. Прызначэнне і функцыі культуры. Пераемнасць і развіццё культуры.

Элітарная, масавая, народная культура. Характэрныя рысы масавай культуры. Асаблівасці элітарнай культуры. Народная культура ў сучасным грамадстве.

Медыякультура сучаснага грамадства. Паняцці медыя і медыякультуры. Асаблівасці медыякультуры. Уплыў медыя на культуру асобы і грамадства.

Субкультура і контркультура. Паняцце субкультуры. Віды маладзёжных субкультур. Контркультура. Адрозненні субкультуры ад контркультуры.

Культурная разнастайнасць і дыялог культур. Праявы ўніверсальнага і ўнікальнага ў культуры. Нацыянальныя культуры. Полікультурнае ўзаемадзеянне. Этнакультурныя стэрэатыпы і праявы ксенафобіі.

Прагрэс і рэгрэс у сацыяльным развіцці. Праявы прагрэсу і рэгрэсу ў сучасным свеце. Грамадскі прагрэс і яго крытэрыі. Выклікі і пагрозы для чалавецтва. Гуманізм як мера грамадскага прагрэсу.

Ступені грамадскага развіцця. Асноўныя падыходы да разгляду гісторыі грамадства. Фармацыйны падыход. Стадыяльны падыход. Тэхналагічны падыход.

Цывілізацыя як культурна-гістарычны працэс. Паняцце цывілізацыі. Цывілізацыйны падыход да вывучэння грамадства. Характэрныя рысы цывілізацыі XXI стагоддзя.

Гарызонты інфармацыйнага грамадства. Асноўныя характарыстыкі інфармацыйнага грамадства. Глабальная камп’ютарная сетка Інтэрнэт. Беларусь у інфармацыйную эпоху: магчымасці і перспектывы развіцця.

Глабалізацыя. Паняцце глабалізацыі. Фактары глабалізацыі. Супярэчлівы характар глабалізацыі. Антыглабалізм.

Устойлівае развіццё – мадэль развіцця XXI стагоддзя. Паняцце ўстойлівага развіцця. Напрамкі ўстойлівага развіцця. Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дасягненні Рэспублікі Беларусь у галіне ўстойлівага развіцця. Прыярытэты ўстойлівага развіцця ва ўмовах канкурэнцыі і санкцыйнага рэжыму.

Дзяржаўная палітыка ў сферы культуры. Гістарычная памяць беларускага народа. Дасягненні ў развіцці культуры суверэннай Беларусі. Асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы ў сферы культуры.

## 2. САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА

Грамадства як сістэма. Паняцце грамадства. Сацыяльнае дзеянне. Сферы жыцця грамадства і сацыяльныя інстытуты. Сацыяльныя групы. Структура і функцыі сацыяльнай групы. Сацыяльныя нормы і паводзіны асобы. Паняцце і прыметы сацыяльных нормаў.

Сацыяльная структура грамадства. Паняцце сацыяльнай структуры. Гарызантальная і вертыкальная арганізацыя грамадства. Сацыяльныя класы. Сацыяльныя страты.

Сацыяльны статус, ролі і мабільнасць. Сацыяльны статус. Сацыяльныя ролі. Сацыяльная мабільнасць. Віды і каналы сацыяльнай мабільнасці.

Зносіны і іх роля ў жыцці чалавека. Зносіны, іх формы. Сродкі зносін. Прынцыпы зносін і этыкет. Спосабы ўздзеяння людзей адзін на аднаго. Асаблівасці віртуальных зносін.

Міжасобасныя адносіны. Віды міжасобасных адносін. Паняцце стэрэатыпу, стэрэатыпы ва ўспрыманні людзей. Спосабы пераадолення забабонаў ва ўспрыманні людзей. Узаемадзеянне людзей у малых групах. Тыпы ўзаемадзеяння (калектывізм, індывідуалізм, канфармізм, нонканфармізм, ганенне і агрэсіўныя паводзіны ў групе). Лідарства, стылі лідарства.

Супярэчнасці міжасобасных адносін. Паняцце «канфлікт», яго структура і дынаміка. Дзелавыя і асобасныя канфлікты. Унутрыасобасныя канфлікты і спосабы іх пераадолення.

Вырашэнне міжасобасных супярэчнасцяў. Правілы канструктыўных зносін і паводзінаў. Стратэгіі паводзінаў у канфліктнай сітуацыі. Урэгуляванне канфлікту.

Сацыяльная камунікацыя. Паняцце сацыяльнай камунікацыі. Структура сацыяльнай камунікацыі. Віды сацыяльнай камунікацыі. Масавая камунікацыя.

Сацыяльныя працэсы і змена грамадства. Сацыяльны працэс і яго віды. Сутнасць і віды масавых паводзінаў. Натоўп. Сацыяльныя рухі.

Сусветнае супольніцтва ў XXI стагоддзі. Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя сістэмы ў сучасным свеце. Міграцыйная мабільнасць і яе наступствы.

Дэмаграфічная палітыка. Дэмаграфічная бяспека. Сацыяльны склад насельніцтва Рэспублікі Беларусь, яго дынаміка. Асноўныя напрамкі дэмаграфічнай палітыкі беларускай дзяржавы. Асаблівасці сучаснай сацыяльнай палітыкі Рэспублікі Беларусь. Беларускія сацыяльныя арыенціры і сацыяльныя гарантыі для грамадзян.

Сямейныя адносіны. Паняцці шлюбу і сям’і. Віды і функцыі сям’і. Сям’я як каштоўнасць.

Маладзёжная палітыка. Моладзь як сацыяльная група. Моладзь – стратэгічны рэзерв дзяржавы. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальная палітыка. Асноўныя напрамкі нацыянальнай палітыкі беларускай дзяржавы.

Гендарная палітыка. Асноўныя напрамкі гендарнай палітыкі беларускай дзяржавы.

Дзяржаўная палітыка ў галіне аховы здароўя, у сферы фізічнай культуры і спорту. Дасягненні ў развіцці аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту суверэннай Беларусі. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы здароўя, у сферы фізічнай культуры і спорту. Дзяржаўная палітыка ў сферы прафілактыкі спажывання наркатычных сродкаў.

Сацыяльныя наступствы спажывання наркотыкаў.

## 3. ДУХОЎНАЯ СФЕРА

Мараль. Сутнасць маральнай рэгуляцыі грамадскага жыцця. Нормы маралі. Дынаміка маральных нормаў і ідэалаў. «Залатое правіла» маралі. Імператыў маральных паводзін. Этыка як навука пра мараль.

Рэлігія. Сутнасць рэлігіі, яе функцыі. Структурныя элементы рэлігіі. Сацыяльная дынаміка рэлігіі. Канфесія. Секулярызацыя і сакралізацыя як працэсы развіцця рэлігіі. Верацярпімасць. Свабода сумлення і веравызнання. Канфесійная палітыка беларускай дзяржавы. Хрысціянства як духоўная аснова беларускага грамадства, міжканфесіянальнага міру і згоды.

Філасофія. Паняцце філасофіі і яе структура. Гістарычная дынаміка філасофіі. Філасофія ў сістэме культуры. Філасофскія падыходы да пазнання рэчаіснасці.

Навука. Навуковае пазнанне, мэты і каштоўнасці навукі. Узроўні навуковага пазнання. Класіфікацыя навук. Тэорыя. Эмпірыя. Навука як сацыяльны інстытут. Паняцце навукова-тэхнічнага прагрэсу. Роля навукова-тэхнічнага прагрэсу ў развіцці чалавецтва. Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. Дасягненні ў развіцці навуковага патэнцыялу суверэннай Беларусі.

Адукацыя. Паняцце адукацыі. Адукацыя як сацыяльны інстытут. Тэндэнцыі развіцця адукацыі.

## 4. ЭКАНАМІЧНАЯ СФЕРА

Эканоміка і яе роля ў жыцці чалавека і грамадства. Паняцце эканомікі. Даброты, рэсурсы, вытворчасць. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць паміж патрэбамі і рэсурсамі ў працэсе эканамічнага выбару. Фактары вытворчасці. Эканамічныя суб’екты і іх узаемасувязі. Характарыстыка асноўных эканамічных сістэм.

Уласнасць і даходы. Адносіны ўласнасці. Асноўныя формы ўласнасці. Віды даходаў. Пражытачны мінімум.

Грашова-крэдытная сістэма. Грошы, іх функцыі і віды. Банкі і іх функцыі. Уклады і крэдытаванне.

Рынак: попыт, прапанова, рынвачная цана. Паняцце і функцыі рынку. Попыт, прапанова і рынвачная цана. Віды рынкаў.

Канкурэнцыя і яе роля ў эканоміцы. Паняцце канкурэнцыі. Віды канкурэнцыі. Менеджмент. Узаемасувязь менеджменту і эфектыўнасці вытворчасці. Маркетынг.

Фінансавая сістэма грамадства. Паняцце фінансавай сістэмы. Дзяржаўны бюджэт. Падаткі, іх віды і роля ў эканоміцы.

Дзяржава і эканоміка. Задачы і метады дзяржаўнага рэгулявання эканомікі. Інфляцыя, яе віды і наступствы. Беспрацоўе, яго віды і наступствы. Сацыяльная палітыка.

Інавацыйнае развіццё краіны. Паняцце інавацыйнага шляху развіцця. Тыпы інавацый. Навуковае забеспячэнне інавацыйнага развіцця. Высокія тэхналогіі і энергазберажэнне. Інавацыйная палітыка. Задачы нацыянальнай інавацыйнай сістэмы. Асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь.

Рэгіянальная палітыка Рэспублікі Беларусь. Рэгіёны Рэспублікі Беларусь. Перспектывы развіцця рэгіёнаў. Малыя гарады Беларусі і перспектывы развіцця сяла.

## 5. ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Палітыка і яе роля ў грамадскім жыцці. Паняцце палітыкі. Палітычны статус асобы. Палітычная сістэма і яе функцыі. Палітычныя эліты і лідары.

Дзяржава ў палітычнай сістэме. Дзяржава – асноўны палітычны інстытут. Прыметы дзяржавы. Функцыі дзяржавы. Форма дзяржавы.

Дэмакратыя. Паняцце дэмакратыі. Формы дэмакратыі. Віды выбарчых сістэм. Прынцыпы дэмакратыі.

Прававая дзяржава і грамадзянская супольнасць. Прынцыпы прававой дзяржавы. Грамадзянская супольнасць і яе асноўныя інстытуты. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць грамадзянскай супольнасці і прававой дзяржавы. Сродкі масавай інфармацыі і іх роля ў палітыцы.

Палітычныя ідэалогіі. Паняцце і функцыі палітычнай ідэалогіі. Асноўныя віды палітычнай ідэалогіі. Ідэалагічная разнастайнасць сучаснасці.

Палітычныя партыі і грамадскія аб’яднанні. Паняцце палітычнай партыі і яе функцыі. Палітычныя партыі і партыйныя сістэмы. Грамадскія аб’яднанні. Адрозненне палітычнай партыі ад грамадскага аб’яднання.

Прававыя асновы міжнародных адносін. Асноўныя прынцыпы міжнароднага права. Крызісныя працэсы ў сферы міжнароднага права. Функцыі міжнароднага гуманітарнага права. Міжнародна-прававая адказнасць.

Геапалітычнае становішча і нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Паняцце геапалітыкі. Геапалітычны статус Беларусі. Нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. Нацыянальная бяспека: рызыкі, выклікі, пагрозы.

Рэспубліка Беларусь у сістэме міжнародных адносін. Паняцце і віды міжнародных адносін. Прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Удзел Беларусі ў міжнародных арганізацыях і міжнародным супрацоўніцтве. Асноўныя сродкі міжнароднага супрацоўніцтва.

## 6. ПРАВА

Паняцце права. Нормы права як рэгулятары паводзін асобы. Права ў сістэме сацыяльных нормаў.

Грамадзянства як прававая сувязь з дзяржавай. Узаемасувязь правоў і абавязкаў грамадзян. Правы і абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыйнае і выбарчае права. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь – Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь. Паняцце канстытуцыйнага права. Месца Канстытуцыі ў прававой сістэме. Структура Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь. Выбарчая сістэма ў Рэспубліцы Беларусь. Прынцыпы і асноўныя стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь. Віды рэферэндумаў. Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.

Паняцце, прынцыпы і пакаленні правоў чалавека. Міжнародныя стандарты па абароне правоў чалавека.

Правы і адказнасць непаўналетніх. Правы дзіцяці ў Рэспубліцы Беларусь. Асноўныя нарматыўныя прававыя дакументы ў сферы абароны правоў дзіцяці. Дзеяздольнасць і адказнасць непаўналетніх у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржаўная ўлада ў Рэспубліцы Беларусь. Прынцып падзелу ўлад. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь – Кіраўнік дзяржавы і гарант Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь і іх паўнамоцтвы. Усебеларускі народны сход – найвышэйшы прадстаўнічы орган народаўладдзя Рэспублікі Беларусь. Парламент – Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Судовая ўлада. Мясцовае кіраванне і самакіраванне.

Асновы грамадзянскага права. Паняцце грамадзянскага права. Суб’екты грамадзянска-прававых адносін. Грамадзянская правaздольнасць і дзеяздольнасць фізічных і юрыдычных асоб.

Асновы сямейнага права. Паняцце сямейнага права. Прававы механізм заключэння і спынення шлюбу. Правы і абавязкі мужа і жонкі. Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей.

Асновы працоўнага права. Паняцце працоўнага права. Працоўны дагавор. Прававы механізм працаўладкавання і спынення працоўнага дагавору. Правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў. Нормы працоўнага права, якія рэгулююць працоўны час, час адпачынку, аплату працы работніка.

Асновы адміністрацыйнага права. Паняцце адміністрацыйнага права. Адміністрацыйнае правапарушэнне. Адміністрацыйная адказнасць. Віды адміністрацыйных спагнанняў.

Асновы крымінальнага права. Паняцце крымінальнага права. Крымінальная адказнасць і пакаранне. Прыметы, якія характарызуюць злачынства. Акалічнасці, якія выключаюць, змякчаюць і абцяжарваюць

крымінальную адказнасць. Віды пакаранняў, якія прадугледжаны Крымінальным кодэксам Рэспублікі Беларусь.

Забеспячэнне законнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь. Сістэма органаў забеспячэння законнасці і правапарадку ў Рэспубліцы Беларусь. Судовая сістэма Рэспублікі Беларусь. Праваахоўныя органы Рэспублікі Беларусь. Органы юстыцыі Рэспублікі Беларусь. Асноўныя задачы органаў у сферы забеспячэння законнасці і правапарадку Рэспублікі Беларусь.

## СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэспубліканскіх рэферэндумах 24 лістапада 1996 г., 17 кастрычніка 2004 г. і 27 лютага 2022 г.) // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь. –URL: https://pravo.by/pravovaya-informatsiya/pomniki-gistoryi-prava-belarusi/kanstytutsyynae-prava-belarusi/kanstytutsyi-belarusi/kanstytutsyya-1994-goda-sa-zmyanennyami-i-dapa-nennyami2022/ (дата звароту: 15.08.2025).

2. Грамадазнаўства: вучэбны дапаможнік для 9 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання / А.М. Данілаў [і інш.]; пад рэд.А.М. Данілава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2020.

3. Грамадазнаўства: вучэбны дапаможнік для 10 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню)/ А.М.Данілаў [і інш.]; пад рэд.А.М.Данілава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2020.

4. Грамадазнаўства: вучэбны дапаможнік для 11 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню / В.І. Чупрыс [і інш.]. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2021.